

ЛІСТАПАД — СЕЗОН ДАЖДЖОЎ 3

КАЛІ АДВАЖЫЦЦА НА НОВУЮ СТРЫЖКУ? 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

3 ЛІСТАПАДА 2023 г. ПЯТНІЦА № 214 (30094)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтрвыбаркама:**

*«Забеспячэнне электаральнага суверэнітэту і бяспекі падчас правядзення выбарчай кампаніі вельмі важнае. Выбары мы праводзім для сваёй краіны, і, вядома, мы павінны паставіць пэўную заслону і знешняму ўмяшанню, і магчымым спробам дэстабілізацыі работы камісій, участкаў для галасавання ў перыяд галасавання і ўвогуле стварэння нейкай напружанай абстаноўкі ў перыяд выбарчай кампаніі. Грамадзяне павінны ў свабоднай форме выказаць сваё волевыяўленне і выбраць таго кандыдата, якога лічаць патрэбным».*

# Канікулы з сэнсам



У час школьных канікул Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны падрыхтаваў займальную праграму для вучняў, іх бацькоў і педагогаў. У прасторы «Музей для дзяцей» былі падрыхтаваны майстар-класы па авіямадэліраванні «Юны лётчык», «Пластылінавы жывапіс», па стварэнні тэматычных паштовак «Восеньскі сюрпрыз» і інш.

Трэцякласніка 135-й сталічнай школы Мікіту ЖЫДЗЕНЯ прывяла ў музей бабуля. Хлопчык не толькі з дапамогай супрацоўніцы музея Кацярыны ВАРАНЦОВАЙ сваімі рукамі зрабіў паштоўку для таты Дзмітрыя, але і прымераў сапраўдны танкісцкі шлем — у музеі ёсць такая магчымасць.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **«Белпошта» датэрмінова выплаціць пенсіі і дапамогі за 7 лістапада.**
- Нацбанк вызначыў пералік сістэмна значных банкаў на 2024 год.
- **Беларусь прэзентавала экспазіцыю на харчовай выставе ў Казахстане.**
- Пуцін падпісаў закон аб ратыфікацыі пагаднення з Беларуссю аб узаемным прызнанні аўташтрафаў.
- **Новае, сучаснае, камфортнае. Інтэрнат для студэнтаў БДУІР і БДМУ адкрыўся ў Студэнцкай вёсцы.**



Спажывец

## Агароднiны і бульбы хопіць усім

**У гэтым сезоне на спажывецкім рынку краіны дасягнута збалансаванасць попыту і прапановы па асноўных групах свежай плодаагародніннай прадукцыі. Пра гэта паведаміла начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля МЕЛЬНІКАВА.**

### СТАБФОНДЫ СТАНУЦЬ БОЛЬШ ГНУТКІМІ

Беларускія сельгасарганізацыі і гандлёвыя сеткі цяпер рыхтуюцца да міжсезоннага перыяду — завяршаецца ўборачная кампанія, ідзе закладка стабфондаў і заключэнне дагавораў на пастаўкі.

Па словах Наталлі Мельнікавай, ужо на міжсезонны перыяд 2022—2023 года ў Беларусі быў устаноўлены новы парадак фарміравання і выкарыстання стабілізацыйных фондаў. Ён прадугледжвае неабходнасць закладкі плодаагародніннай прадукцыі на міжсезонны перыяд пад поўную патрэбу ўнутранага рынку і выкуп арганізацыямі гандлю з дапамогай заключэння дагавораў на пастаўку пад закладзены аб'ём.

СТАР. 4

Камунальныя стасункі

## ЖЫЛЛЁ КАМФОРТНАЕ І АРЭНДНАЕ

### Якія пытанні разглядалі камунальнікі на калегіі ЖКГ у Оршы

**Капітальна адрамантавана ў Беларусі сёлета павінна быць 3 632,3 тысячы м² жылля. За дзевяць месяцаў зроблена 2 374,8 тысячы м², што адпавядае амаль 107 % ад даведзенага на гэты перыяд задання. Больш як у паўтара раза (на 169 %) у краіне перавыканана заданне па мадэрнізацыі 12 газавых і 37 кацельных на мясцовых відах паліва — замест гэтага рэканструяваны ўжо 83 аб'екты. Заменена звыш 340 кіламетраў сетак водазабеспячэння пры плане на дзевяць месяцаў амаль 230 кіламетраў і каля 128 кіламетраў каналізацыі пры плане 96 кіламетраў.**
**Па некаторых іншых паказчыках ёсць недапрацоўка. Напрыклад, недастаткова наладжана работа па зборы другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), якіх, згодна з планам, да 2025 года павінна быць да 970 тысяч тон, прычым з разбіўкай па відах смецця: папера і кардон, электраабсталяванне, шкло, шыны, палімеры, адпрацаваныя маслы. І гэта толькі частка таго, што прагучала на калегіі. Якія яшчэ пытанні абмяркоўваліся, паслухала карэспандэнт «Звязды».**

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



З першых вуснаў

# «ЗЫХОДЗЯЧЫ З ВЫКЛЮЧНА АГУЛЬНАДЗЯРЖАЎНЫХ ЗАДАЧ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ»

## Мэтазгоднасць стварэння сістэмы ваенных пракуратур абмеркавалі на нарадзе ў Прэзідэнта

**Пытанне павышэння ролі пракуратуры ў грамадстве гучала падчас нядаўніх нарад кіраўніка дзяржавы з сілавым блокам. На мэтазгоднасць стварэння сістэмы ваенных пракуратур, а таксама ўзмацненне кантролю за выкананнем заканадаўства сярод ваеннаслужачых Аляксандр Лукашэнка звяртаў увагу на сустрэчы з генеральным пракурорам у ліпені. Было даручана разгледзець пытанне стварэння сістэмы ваенных пракуратур комплексна. Канкрэтныя прапановы на гэты конт учора прагучалі ў шырокім складзе, з удзелам кіраўніцтва сілавога блока краіны.**

Рашэнне аб ліквідацыі сістэмы ваенных пракуратур прынялі ў 2014 годзе. Паўнамоцтвы па ажыццяўленні нагляду за выкананнем заканадаўства ва Узброеных Сілах, іншых войсках і воінскіх фарміраваннях Беларусі былі перададзены грамадзянскім органам пракуратуры. Аднак абстаноўка ў свеце і непасрэдна каля нашых граніц прымушае зноў на самым высокім узроўні вярнуцца да пытання кантролю за выкананнем заканадаўства ва Узброеных Сілах, іншых войсках і воінскіх фарміраваннях.

Кіраўнік дзяржавы не стаў нагадваць, чым у 2014 годзе было выклікана рашэнне аб ліквідацыі ваенных пракуратур. Аднак задаў правамернае пытанне: ці памянялася абстаноўка ў тых галінах, дзе пракуроры павінны назіраць за аднастайным дакладным выкананнем беларускага заканадаўства? «Напэўна, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Паўстае пытанне: настолькі памянялася, што нам трэба сёння ствараць ваенныя пракуратуры, узнавіць іх?»

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што рашэнне аб ліквідацыі ваенных пракуратур прымалася ў іншых умовах і было накіравана ў тым ліку на скарачэнне штатнай колькасці ў рамках рэформы дзяржапарату, а таксама скарачэнне расходавання бюджэтных сродкаў. «У якасці дзейснай меры па вырашэнні названых вышэй задач генеральным пракурорам (а задачы застаюцца тыя ж) прапанавана стварыць Галоўную ваенную пракуратуру і міжгарнізонныя ваенныя пракуратуры», — паведаміў беларускі лідар і прапанаваў вызначыцца па гэтым пытанні.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што выказвалася і альтэрнатыўнае меркаванне аб мэтазгоднасці стварэння такой сістэмы, але толькі ва ўмовах ваеннага часу. «Таксама пытанне: не дай бог, пачалася вайна, мы хутка ствараем пракуратуры, — заўважыў ён. — Без гэтага справіцца не можам? Калі не можам, магчыма, і трэба. Калі зможам, навошта?»

Прэзідэнт пацікавіўся ў прысутных, адкуль увогуле з'явілася пытанне аб узнаўленні ваенных пракуратур. «Чаму сёння гэтае пытанне ўзнятае, пракурорамі перш за ўсё? — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — І пытанне галоўнае: трэба сёння ці не трэба ўзнаўляць сістэму пракурорскага нагляду, якая была да 2014 года? Чакаю канкрэтных прапаноў, зыходзячы з выключна агульнадзяржаўных задач забеспячэння нацыянальнай бяспекі».

Як паведаміў генеральны пракурор Андрэй Швед, органы пракуратуры працуюць на павышэнне эфектыўнасці наглядной дзейнасці па ўсіх кірунках. Па яго словах, рэалізаваны шэраг ведамасных ініцыятыў, якія ўжо даюць свой вынік.

«У сувязі з ваенна-палітычнай абстаноўкай, якая існуе паблізу нашых граніц, намі праведзены аналіз арганізацыі нагляду за законнасцю ў войсках іншых краін, у тым ліку падчас ваенных канфліктаў, — адзначыў Андрэй Швед. — Ва ўсім свеце ваенныя пракуроры з'яўляюцца абавязковым элементам сістэмы нацыянальнай бяспекі. Іх функцыянал паўсюдна задзейнічаны ва ўсіх ваенных канфліктах».

Пасля абмеркавання пытанняў, якія гучалі падчас нарады, Прэзідэнт рэзюмаваў, што на дадзены момант няма неабходнасці ствараць сістэму ваенных пракуратур. Аднак аснову гэтай сістэмы ўжо сёння варта выкрышталізаваць унутры Генеральнай пракуратуры. Даручана падрыхтаваць адпаведныя кадры, зразумець фармат работы ў гэтым кірунку, а таксама наладзіць міжведамаснае ўзаемадзеянне. Калі адпаведная сістэма будзе выбудавана і на тое будзе неабходнасць, адпаведнае рашэнне па разгортванні сістэмы ваенных пракуратур прымуць у кароткія тэрміны.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што варта павышаць і ўдасканальваць пракурорскі нагляд, у тым ліку ва Узброеных Сілах і іншых воінскіх фарміраваннях. На думку беларускага лідара, супрацоўнікі ведамства павінны бачыць, што адбываецца ў падраздзяленнях, валодаць усёй неабходнай інфармацыяй і сачыць за выкананнем заканадаўства.

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

Як расказаў у размове з журналістамі **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД**, кіраўнік дзяржавы адзначыў неабходнасць далейшага ўзмацнення ролі пракуратуры як наглядняга органа і прыняцця ўсіх мер, каб узмацніць пракурорскі нагляд, у тым ліку за нашымі Узброенымі Сіламі, воінскімі фарміраваннямі. «Пастаўлена задача — у найбліжэйшы час пачаць работу ў Генеральнай пракуратуры па падрыхтоўцы будучых ваенных пракурораў, — удакладніў кіраўнік ведамства. — Павінна быць створана свайго роду прамежкавая сістэма (структура), якая падрыхтуе неабходныя кадры, што маюць вопыт ваеннай службы, разумеюць спецыфіку наглядной дзейнасці ва Узброеных Сілах і воінскіх фарміраваннях».

Па словах генпракурора, калі прыйдзе час, пры неабходнасці будзе прынята рашэнне аб стварэнні ваеннай пракуратуры. «У гэтым кірунку неабходна рухацца, — дадаў ён. — Задача пастаўлена, яна будзе выконвацца».

У сваёй акрузе

# Далучыліся да эстафеты дабра

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, актывісткі грамадскай арганізацыі «Беларускі саюз жанчын» Наталля ТАРАСЕНКА і Людміла ЗДОРЫКАВА не ўпершыню ўдзельнічаюць у добрых справах спартсмена-паралімпійца, заснавальніка Дабрачыннага фонду Аляксея Талая. Першы раз яны перадалі фонду дзіцячае харчаванне для дзяцей з Данбаса. Цяпер арганізавалі збор усяго неабходнага для Марыупальскага радзільнага дома, які сёння мае вострую патрэбу ў харчаванні, прадметах догляду і адзенні для нованароджаных.**

— Каманда Аляксея ўжо шмат гадоў аказвае дапамогу дзецям і маладым інвалідам у Беларусі ў лячэнні і рэабілітацыі, — расказвае Наталля Тарасенка. — З моманту пачатку СВА межы дапамогі пашырыліся да гарадоў і пасёлкаў Данбаса. Калі Аляксей расказваў пра тое, як жывуць гэтыя людзі, сэрца сціскалася ад жалю да народа, на лёс якога выпала столькі пакут. Неабыякавыя беларусы збіралі самае патрэбнае і жыццёва важнае для старых, жанчын, дзяцей, якія засталіся без даху над галавой. Да нас змаглі прыехаць адпачыць і падлячыцца дзеткі з Данецкай і Луганскай абласцей. На апошняй сустрэчы з Аляксеем і нарадзілася ідэя аб маштабнай дабрачыннай акцыі, якая ў хуткім часе была абвешчана — інфармацыйна-дабрачынны праект «Эстафета дабра». Мы сталі яго ініцыятарамі ў сваіх выбарчых акругах на магілёўскай зямлі.

Да акцыі далучыліся ўстановы адукацыі і культуры, працоўныя калектывы прадпрыемстваў і арганізацый, прадстаўнікі сілавога блока, неабыякавыя грамадзяне. На адрас Магілёўскага аддзялення фонду Талая практычна штодзень прыходзілі пасылкі з пялёнкамі, адзеннем для нованароджаных, сухімі малочнымі сумесямі для немаўлят, падгузкамі, вільготнымі сурвэткамі і іншымі рэчамі. Груз атрымаўся агульнай вагой больш чым тону. Спатрэбілася два рэйсы, каб перавезці яго ў Мінск. Менавіта адтуль аўтацягнік накіруецца ў Данецкую вобласць.



Да акцыі далучылася ў тым ліку і моладзь.

— Мы вельмі ганарымся нашай краінай і людзьмі, — кажуць народныя абраннікі. — У нас хапае неабыякавых грамадзян, якія гатовы прыйсці на дапамогу. І сяброў у магілёўскага аддзялення Дабрачыннага фонду імя Аляксея Талая, якім кіруе Віталь Бярозка, вельмі шмат. Непасрэдны ўдзел у зборы дапамогі прынялі прадстаўнікі Магілёўскага гарадскога шматпрофільнага цэнтра па рабоце з дзецьмі і моладдзю «Юнацтва». Яго кіраўнік Вольга Прыгодзіч нават накіравала асабісты падарунак і ліст сябрам з Данецкай вобласці. Непасрэдны ўдзел у рэалізацыі добрай справы прыняў кардыянатар пошукавага атрада «Луч» Сяргей Тышкавец. А дапамогу ў пагрузцы грузу аказаў маладзёжны актыў пры Магілёўскім гарвыканкаме. Вялікі дзякуй усім, хто не застаўся ўбаку.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Наталлі ТАРАСЕНКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Амерыканскі сенатар лічыць, што ў ЗША найвышэйшая рызыка тэрактаў




Сенатар-рэспубліканец ад штата Тэхас Тэд Круз заявіў, што рызыка тэрарыстычнай атакі ў ЗША цяпер з'яўляецца найвышэйшай з часу тэрактаў 11 верасня 2001 года. Пра гэта паведаміла The Hill. Па меркаванні сенатара, такая высокая рызыка існуе з-за абвастрэння канфлікту паміж Ізраілем і групоўкай ХАМАС. «Вы сумяшчаеце вайну на Блізкім Усходзе з адкрытай паўднёвай граніцай», — сказаў Круз у эфіры Fox News. Сенатар пры гэтым назваў граніцу «запрашэннем» для патэнцыяльных пагроз нацыянальнай бяспекі. «Гэта запрашэнне ад Белага дома Байдэна: калі вы тэрарыст і хочаце забіваць амерыканцаў, прыязджайце ў Мексіку, і яны вас упусцяць», — эмацыянальна выказаўся Круз. Дырэктар ФБР Крыстафер Рэй раней заявіў, што ў ЗША назіраецца «гістарычны» ўзровень антысемітызму. Ён адзначыў, што «самая вялікая тэрарыстычная пагроза» для ЗША — гэта адзінокія суб'екты або невялікія групы людзей, якія настроены на гвалт у сетцы інтэрнэт і выкарыстоўваюць «лёгкадаступную» зброю для нападу на «лёгкія мэты».

### У Сербіі распусцілі парламент і прызначылі пазачарговыя парламенцкія выбары

Прэзідэнт Сербіі Аляксандр Вучыч падпісаў указ аб роспуску Народнай Скупшчыны і прызначыў дату правядзення пазачарговых парламенцкіх выбараў у краіне на 17 снежня. Пра гэта ён паведаміў у эфіры тэлеканала РТС. Кіраўнік дзяржавы ў сваім звароце адзначыў, што цяпер «цяжкія часы і неабходна, каб усе былі адзіныя ў барацьбе за захаванне жыццёва важных нацыянальных і дзяржаўных інтарэсаў Рэспублікі Сербія». Ён заўважыў, што для краіны вельмі важна захаваць мір, стабільнасць, унутраную згуртаванасць і прадэманстраваць дэмакратыю. Раней урад Сербіі накіраваў прэзідэнту краіны аргументаваную прапанову распусціць Народную Скупшчыну і прызначыць выбары народных дэпутатаў. Як заявіў урад, правядзенне новых парламенцкіх выбараў у існуючых абставінах забяспечыць больш высокую ступень дэмакратыі, зніжэнне напружанасці, што ўзнікае паміж супрацьлеглымі варыянтамі ў грамадстве, адмову ад выключнасці і распальвання нянавісці, а таксама пацвярджэнне права свабодна выказваць думкі і погляды па пэўных палітычных, эканамічных і іншых пытаннях.



### Словам года стаў «штучны інтэлект»



Аўтарытэтны брытанскі слоўнік англійскай мовы Collins прызнаў словам гэтага года тэрмін AI (штучны інтэлект). Аб гэтым паведамляецца на афіцыйным сайце слоўніка. Як адзначаюць складальнікі Collins, штучны інтэлект сёння хутка развіваецца і ўсё больш уваходзіць у жыццё грамадства. AI, якому ўдзяляецца шмат увагі, з'яўляецца сферай будучай тэхналагічнай рэвалюцыі, пра яго шмат казалі і кажуць у 2023 годзе. Каб вызначыць слова года, спецыялісты прааналізавалі тэксты, апублікаваныя сёлета ва ўсім свеце ў СМІ, на сайтах, у кнігах, а таксама ў сюжэтах, якія выходзілі ў эфіры радыё і тэлебачання. Аб'ём вывучанага матэрыялу склаў 20 мільярдаў слоў. «Мы ведаем, што на AI сёлета быў вялікі акцэнт у тым сэнсе, што ён развіваўся і хутка стаў усюдыісным, убудаваным у наша жыццё праз імэйлы, стрымінгі і іншыя паўсядзённыя тэхналогіі, якія некалі здаваліся футурыстычнымі», — заўважыў дырэктар выдавецтва, якое выпускае слоўнік.

# ЖЫЛЛЁ КАМФОРТНАЕ І АРЭНДНАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## РУЙНАВАЦЬ ЦІ БУДАВАЦЬ?

Галоўнымі тэмамі пасяджэння сталі вынікі работы сістэмы ЖКГ і выкананне дзяржпраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021—2025 гады за дзевяць месяцаў 2023 года. А таксама выкарыстанне арэнднага жылля, якое не запатрабавана ў краіне цягам паўгода.

— За дзевяць месяцаў галіна спрацавала няблага. З 16 паказчыкаў дзяржпраграмы не выканана два: не дасягнуты вызначаны ўзровень замены цепласетак і рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў, — ацаніў сітуацыю **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь ТРУБІЛА.**

Што датычыцца арэнднага жылля, большасць яго сканцэнтравана ў сельскай мясцовасці (больш за 3000 адзінак), то гэтае пытанне назваць беспраблемным пакуль немагчыма. Штогод у Беларусі прырастае такога жылля, аднак нямала такіх будынкаў амаль што непрыдатных для пражывання. На думку міністра, многія з такіх адзінак жылля варта было б знесці, каб яны не існавалі на балансе і не стваралі статыстыку, што арэнднага жылля шмат і проста яго ніхто не хоча...

Сёлета ад рынку арэнднага жылля атрымана амаль 50 мільёнаў рублёў, большасць з якіх выкарыстоўваецца на будаўніцтва новага арэнднага жылля, а магчыма, лепш было б патраціць нейкую частку на знос непатрэбных адзінак, выказаўся Генадзь Трубіла.



Жылыя дамы набылі новае аблічча пасля капрамонту.

Удзельнікі калегіі наведалі таксама аб'екты капітальнага рамонту — два жылыя дамы ў Оршы (1980 года пабудовы) па вуліцы 60 гадоў БССР, дзе былі заменены парапетныя пліты, адрамантаваны лоджыі і балконы, адрамантаваны і афарбаваны цокаль, фасад і іншае. У найбольш халодных месяцах дома зрабілі ўцяпленне.

## ПЕРАКІНУЦЬ КАНАЛІЗАЦЫЙНЫЯ СЦЁКІ

Госці Оршы таксама ацанілі праект, згодна з якім сцёкавыя воды гарадскога пасёлка Копысь «перакінулі» на ачышчальныя збудаванні Оршы. Копысь знаходзіцца за 20 кіламетраў ад Оршы і перад камунальнікамі стаяла пытанне, што рабіць: аднаўляць ачышчальныя збудаванні (1979 года пабудовы), якія знаходзіліся на беразе ракі, у выніку чаго меліся праблемы з прыродаахоўнымі арганізацыямі, ці перанакіроўваць сцёкавыя воды на ачыстку ў іншыя ачышчальныя збудаванні. Абралі другі варыянт.

— Мы кіраваліся тым, каб перакінуць на ачышчальныя збудаванні Оршы не толькі воды Копысі, але і іншых пасёлкаў: Зубава, Антонаўкі, Звёздны, якія таксама мелі сістэму каналізавання, — падзяліўся **Аляксей ХВАЛЬКО, генеральны дырэктар прадпрыемства «Віцебскводаканал».** — Мы пралічылі, у колькі абыдзецца аднаўленне існуючых ачышчальных збудаванняў, колькі ў будаўніцтва калектараў і каналізацыйных помпавых станцый (КПС), і па капітальных затратах вырашылі на карысць калектараў і КПС. Літаральна днямі аб'ект увялі ў эксплуатацыю.

Ён удакладніў, што 80 % сцёкавых вод у Копысі ад маласырзавода, тарыфы на ачыстку для якога як юрыдычнай асобы дазволяць пасля рэалізацыі гэтага аб'екта выйсці па сабекошце амаль у нуль. З 700 м³ сцёкавых вод, якія будуць перапампоўвацца на збудаванні ў Оршы, 400 м³ належаць юрасобе.

— Мы рэалізавалі таксама перакідванне сцёкавых вод з Балбасава ў Барань, сёлета таксама па праграме рэалізавалі праект па перакідванні сцёкавых вод аграгарадка Межава на Юрцава (адгэтуль за два гады плануем рэалізаваць праект, каб перакінуць сцёкі на аршанскія збудаванні), — удакладніў гендырэктар. — Тое ж самае будзем рабіць у Глыбокім раёне па перанакіроўванні сцёкаў з некалькіх пасёлкаў на асноўныя ачышчальныя збудаванні (ужо гатовы праект). Налета, пэўна, будзем ліквідаваць ачышчальныя збудаванні ў пасёлку Акцябрскі (пад Віцебскам), дзе жыве каля пяці тысяч чалавек, і перакідваць сцёкі на віцебскія ачышчальныя.

Міністр, уражаны ўбачаным, паабяцаў правесці тэматычную нараду па ачышчальных збудаваннях:

— Калі ёсць куды перакінуць сцёкі (каб не рамантаваць збудаванні), то гэта добрае рашэнне. Нам не трэба гнацца за колькасцю такіх аб'ектаў, а глядзець на тое, што сапраўды неабходна зрабіць.



Дырэктар прадпрыемства «Аршанская спецаўтабаза» Андрыян ГАТАЛЬСКІ атрымаў сімвалічны ключ ад новага завода.

## САРТАВАЦЬ НЕЛЬГА ЗАХОЎВАЦЬ

Калегія ў Оршы супала з афіцыйным адкрыццём смеццесартавальнага завода магутнасцю 60 тысяч тон, таму ўдзельнікі наведалі цырымонію ўрачыстага адкрыцця аб'екта. Рэгіянальны палігон цвёрдых бытавых адходаў Оршы, які ўзводзілі два гады, стаў важным аб'ектам для Аршанскага, Дубровенскага і Талачынскага раёнаў. У тым выглядзе, у якім ён збудаваны, аб'ект унікальны, бо, напрыклад, той жа смеццеперапрацоўчы завод у Віцебску па тэхналогіі крыху прасцейшы, ахарактарызаваў міністр:

— З дапамогай гэтага завода мы павялічым працэнт выкарыстання ДМР, менш захаваем на палігоне адходаў, якія не раскладаюцца, тым самым палепшым экалогію рэгіёна. З улікам таго, што ўжо ёсць завод у Віцебску, вось гэты новы ў Оршы, за пяцігоддзе на Віцебшчыне застанецца збудаваць тры заводы (пры гэтым Наваполацкі завод ужо праектуецца). Такім чынам мы цалкам закрыем пытанне атрымання другасных сыравін з адходаў, — падкрэсліў міністр ЖКГ. — Сёння ўзровень атрымання ДМР складае 34 %, да 2025-га лічба павінна скласці 64 %.

Гэты аб'ект яшчэ раз нагадвае, што энергазберажэнне, экалогія, «зялёны» парадак дня для нас не пусты гук, расказаў **Аляксандр СУБОЦІН, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

— Завод будзе абслугоўваць тры раёны, і тут будзе сартавацца камунальнае смецце, перапрацоўвацца драўняныя і бітумныя адходы. Такім чынам, у Оршы, вобласці і краіне стала адным аб'ектам больш, і жыць стане крыху чысцей і экалагічней.

Яшчэ ў 2012-м быў у краіне толькі адзін падобны аб'ект — Брэсцкі смеццеперапрацоўчы завод. За дзесяцігоддзе ў Беларусі збудавана ўжо восем смеццесартавальных заводаў, праектуюцца аб'екты ў Ваўкавыску і Мінску, будуецца ў Бабруйску, дадаў Генадзь Трубіла:

— Дзякуючы з'яўленню арганізацыі «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў», якая вызначыла далейшае развіццё галіны абыходжання з камунальнымі адходамі, мы захоўваем нашу прыроду, сартуем камунальныя адходы, якія раней захоўваліся.

Веніямін Барсукоў, дырэктар Віцебскага абласнога ўпраўлення капітальнага будаўніцтва (заказчык аб'екта), і Дзмітрый Церашкоў, галоўны інжынер таварыства «Аршанскі будтрэст № 18» (генеральны падрадчык), перадалі сімвалічны ключ ад завода дырэктару прадпрыемства «Аршанская спецаўтабаза» Андрыяну Гатальскаму.

## РАЗВІЦЦЁ ЗГОДНА З УКАЗАМ

На Аршаншчыне, якая сёння характарызуецца як буйны індустрыяльны цэнтр (тут 28 прамысловых прадпрыемстваў), жыве 143 тысячы чалавек. Раён вядомы льнянымі вырабамі (Аршанскі льнокамбінат лічыцца найбуйнейшым у свеце вытворцам гэтай прадукцыі) і металарэзнымі станкамі. Орша — найбуйнейшы чыгуначны вузел у Беларусі (за суткі на станцыі апрацоўваецца да 45 грузавых цягнікоў), расказаў прымаючы бок — **Ігар МАРОЗ, старшыня Аршанскага райвыканкама:**

— У гарадскім пасёлку Балбасава збудаваны мультымадальны прамыслова-лагістычны комплекс «Брэміна-Орша» са сваім аэрапортам. А 13 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў раёна забяспечваюць 13 % валавой вытворчасці ў Віцебскай вобласці. За пяць гадоў у сферы ЖКГ праведзена каласальная работа. Уведзена пасля капрамонту звыш 500 тысяч м² жылых дамоў, пракладзена 35 кіламетраў сетак водазабеспячэння і 70 кіламетраў цепласетак, адрамантавана 115 прыдамавых тэрыторый.

Штуршком для развіцця Аршанскага раёна стала даручэнне Прэзідэнта і яго Указ № 506 «Аб развіцці Аршанскага раёна Віцебскай вобласці» (ад 31 снежня 2018-га), які паставіў задачы, у тым ліку і ў частцы ЖКГ, і яны выконваліся. Аршанскаму краю як раёну з перспектыўным развіццём было даведзена павышанае заданне, у тым ліку па капрамонце жылфонду і добраўпарадкаванні тэрыторый, і тут з гэтым прыстойна справіліся, ахарактарызаваў сітуацыю міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

— У краіне штогод капітальна рамантуецца 2,8 % жылля, а ў Аршанскім раёне гэты паказчык ужо 6 %. Вуліцы і двары ў горадзе і раёне добраўпарадкаваны. Адзінае, што патрабуецца, — не зніжаць тэмпы.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Надвор'е

# І зацягнуцца восеньскія дажджы...

**Затое ўначы без замаразкаў і днём да 17 цяпла**

**Калі ў канцы першага тыдня лістапада нам выпала доўгія выхадныя, значыць, на вуліцы будзе цёпла. Праўда, восеньскае пацяпленне будзе суправаджацца «лёгкімі» і не вельмі, кароткачасовымі дажджамі. У гэтыя чатыры дні (4—7 лістапада) у начныя гадзіны тэмпература паветра будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 3—4 градусаў да плюс 8—10 градусаў, а днём пры гэтым у асноўным будзе ад 7 цяпла да плюс 14 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Сёння будзе пераважна без ападкаў, толькі ў другой палове дня ў крайніх заходніх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі згусціцца слабы туман. Удзень месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, а на захадзе — да 8 цяпла. Днём чакаецца плюс 9—15 градусаў.

"Заліваць" нас пачне ўжо ў суботу. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы ў многіх раёнах будзе ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы ў межах ад плюс 4 да плюс 10 градусаў, а ўдзень — 7—14 цяпла.

"Свята" мокрых ног чакаецца ў нядзелю. Менавіта 5 лістапада на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, ноччу і раніцай па паўднёвым усходзе чакаюцца моцныя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі згусціцца слабы туман. Уначы слупок тэрмометра пакажа плюс 3—8 градусаў, а ўдзень 7—14 цяпла. Па паўднёвым усходзе ноччу будзе плюс 9—12 градусаў, а днём — плюс 15—17 градусаў. Калі б не дажджы, то па тэмпературным узроўні гэтыя дні можна было б назваць позним бабіным летам.

У панядзелак таксама на большай частцы тэрыторыі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 4 да плюс 10 градусаў, а ўдзень — ад плюс 7 да плюс 13 градусаў.

У аўторак месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах — слабы туман. Ноччу тэмпература павысіцца да плюс 4—9 градусаў, а днём — да 5—12 цяпла. У сераду месцамі таксама прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—8 градусаў, а ўдзень — ад 5 да 11 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Агароднiны i бульбы хопiць усiм

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«У гэтым сезоне заключэнне дагавораў павінна завяршыцца да 15 лістапада, а фарміраванне стабілізацыйных фондаў — да 1 снежня. У выпадку зніжэння пакупніцкага попыту і нявыбаркі ўстаноўленых графікамі расходавання стабілізацыйных фондаў захавальнікі маюць права рэалізаваць лішкі па ўласным меркаванні», — патлумачыла спецыяліст.

Яна расказала, што ў бягучым годзе ў стабілізацыйныя фонды павінна быць закладзена 122,8 тысячы тон свежай плодаагароднінай прадукцыі, што складае 86 % да аналагічнага перыяду мінулага года. «Зніжэнне закладкі звязана з пераглядам міжсезоннага перыяду. Так, для капусты, яблыкаў і цыбулі міжсезонны перыяд устаноўлены з 1 снежня па 30 сакавіка, а для бульбы, морквы і буракоў — з 1 снежня па 31 мая».

**Сёння рознічныя цэны ў краіне сталі значна ніжэйшымі за папярэднія гады. Так, цэны на бульбу складаюць ад 50 капеек да 2 рублёў за кілаграм, буракі і капусту — да рубля і крыху больш, цыбулю рэпчатую і моркву — да 2 рублёў, яблыкі — да 3 рублёў.**

Як адзначыла Наталля Мельнікава, для нашай краіны аб'ёмы закладкі складаюць каля 11 % ад вытворчасці плодаагароднінай прадукцыі ў сельгасарганізацыях і фермерскіх гаспадарках. «На сёння ў стабілізацыйныя фонды ўжо закладзена 65 тысяч тон свежай плодаагароднінай прадукцыі, што складае больш за палову нашай патрэбы», — заявіла яна. Так, у гэтым міжсезонным перыядзе асаблівая ўвага будзе надавацца закладцы прадукцыі ў сховішчы, якая мае адпаведныя ўмовы захоўвання і магчымасць забяспечыць захаванасць прадукцыі да канца міжсезоннага перыяду.

«У адпаведнасці з рашэннямі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама захавальнікамі стабфондаў будуць з'яўляцца 127 арганізацый. Іх пералік можа быць зменены з улікам таго, што дагаворы яшчэ працягваюць заключацца. Таксама будзе праводзіцца выбарка прадукцыі і закладка ў стабілізацыйныя фонды», — адзначыла Наталля Мельнікава.

Асаблівую ўвагу надаюць тэхналогіям захоўвання. Напрыклад, пад кожны сорт распрацоўваюцца свае рэцэптуры захоўвання ў газавым асяроддзі, расказаў **дырэктар Інстытута пладаводства НАН Беларусі Аляксандр ТАРАНАЎ.** Такія сховішчы нельга адкрываць, калі ўздумаецца. Камера з гэтымі пэўнымі ўмовамі закладваецца на ўвесь перыяд захоўвання.

## КРАМЫ ВЯЛІКІЯ І НЕ ВЕЛЬМІ

На сёння ў краіне вызначана дзесяць буйных гандлёвых рэспубліканскіх сетак, доля якіх у рознічным тавараабароце складае практычна 50 %.

«Аблвыканкамам накіраваны лічбы патрэбы ў плодаагароднінай прадукцыі на міжсезонны перыяд 2023/2024 года гэтых дзесяць буйных гандлёвых сетак у разрэзе рэгіёнаў і наменклатуры стабілізацыйных фондаў. У тым ліку накіраваны пералік сельгасвытворцаў,



з якімі гандлёвыя арганізацыі маюць доўгатэрміновыя дагаворы на ўзаемавыгадных умовах», — удакладніла Наталля Мельнікава.

Паводле яе слоў, для эфектыўнага правядзення закладкі прадукцыі ў стабілізацыйныя фонды прайшлі рабочыя сустрэчы з гандлёвымі сеткамі, сельгасвытворцамі і фермерскімі гаспадаркамі па фарміраванні і выкарыстанні закладкі на гэты міжсезонны перыяд. «На такіх нарадах у вытворцаў была магчымасць азнаёміцца з умовамі ўваходжання ў гандлёвыя сеткі і патрабаваннямі да якасці плодаагароднінай прадукцыі, заключыць дагаворы пад поўную патрэбу, а таксама адпрацаваць усе спрэчныя моманты, якія ўзнікалі ў мінулы міжсезонны перыяд. На сёння дагаворы заключаны на 73 тысячы тон прадукцыі, або практычна на 60 % ад неабходных аб'ёмаў закладкі. Буйнымі рэспубліканскімі сеткамі заключаны дагаворы на 100 % пад іх поўную патрэбу».

Гаворачы аб выніках мінулага міжсезоннага перыяду, Наталля Мельнікава адзначыла, што ў стабфонды тады было закладзена 142 тысячы тон прадукцыі.

«Праблемных пытанняў па адсутнасці тавараў на паліцах нашых магазінаў не ўзнікала. Забеспячэнне насельніцтва плодаагароднінай прадукцыяй ажыццяўлялася практычна ў поўным аб'ёме, а імпарту ў дадзены перыяд практычна не было. Па выніках такой зладжанай работы гандлю і захавальнікаў свежай плодаагароднінай прадукцыі мы дасягнулі высокай долі продажаў айчынных агароднін і садавіны. Напрыклад, айчынных яблыкаў у нас на сёння прададзена на 18,4 % больш, чым у мінулым годзе, бульбы — на 3,3 %, капусты — на 11 %, буракоў — на 19 %», — падзялілася данымі начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Мінгандлю.

Спецыяліст таксама звярнула ўвагу на тое, што сённяшнія рознічныя цэны ў краіне сталі значна ніжэйшымі за папярэднія гады. Так, цэны на бульбу складаюць ад 50 капеек да 2 рублёў за кілаграм, буракі і капусту — да рубля і крыху больш, цыбулю рэпчатую і моркву — да 2 рублёў, яблыкі — да 3 рублёў.

## БАГАТЫ СЕЗОН

Як адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення бульбаводства, плодаагародніцтва, аграхіміі і абароны раслін Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Таццяна ГУМЯНЮК,** ураджайнасць бульбы і іншай агародніны сёлета значна вышэйшая за летась.

Завяршаецца ўборка бульбы (убралі 99 % плошчы), а іншай агародніны ўбралі 80 % плошчы. «Сёлета ў сельскагаспадарчых арганізацыях і фермерскіх гаспадарках мы плануем атрымаць больш за мільён тон бульбы, а таксама больш за 610 тысяч тон агародніны адкрытага і закрытага грунту. Акрамя таго, плануем сабраць 228 тысяч тон пладоў і ягад, з іх 207 тысяч тон — яблыкі рознага тэрміну паспявання, — расказала Таццяна Гумянюк. — Ураджайнасць сёлета значна вышэйшая за леташнюю: па бульбе яна вырасла на 48 ц/га, а па агародніне — на 49 ц/га».

**У гэтым міжсезонным перыядзе асаблівая ўвага будзе надавацца закладцы прадукцыі ў сховішчы, якая мае адпаведныя ўмовы захоўвання і магчымасць забяспечыць захаванасць прадукцыі да канца міжсезоннага перыяду.**

Аб'ёмы прадукцыі, якія вырабляюцца, дазваляюць краіне ў поўнай меры ажыццявіць засыпанне насеннага фонду, закладку ў сховішчы сельгасарганізацый і ў стабілізацыйныя фонды, а таксама актыўна пастаўляць прадукцыю для рэалізацыі на рынках і кірмашах. Акрамя таго, задавальняецца патрэба і прамысловай перапрацоўкі.

«У гэтым годзе для закладкі ў стабілізацыйныя фонды прадукцыя падрыхтоўваецца больш старанна, каб яе якасць не выклікала нарaканняў у спажыўцоў. Адзначу, што ёмістасць сховішчаў для прадукцыі ў агульнай складанасці мае больш за мільён тон, з іх амаль 720 тысяч тон прыпадае на бульбасховішчы, 181 тысяча тон — на сховішчы для агародніны і 105 тысяч тон — на пладасховішчы. Пры гэтым ёмістасць сховішчаў з рэгуляваным газавым асяроддзем знаходзіцца на ўзроўні 11 тысяч тон», — дадала Таццяна Гумянюк.

Спецыяліст таксама нагадала, што нарошчванне вытворчасці яблыкаў ажыццяўляецца ў рамках дзяржпраграмы, у адпаведнасці з якой штогод закладваецца не менш за 500 гектараў садоў, у прыватнасці садоў інтэнсіўнага тыпу. Асаблівая ўвага ўдзяляецца ў першую чаргу сартам зімовага тэрміну спажывання.

## ТАМАТЫ Ў МІЖСЕЗОННЕ ТОЛЬКІ ЧАСТКОВА БУДЗЕМ ЗАКУПЛЯЦЬ ЗА МЯЖОЙ

Як падкрэсліла спецыяліст, у Беларусі, акрамя баршчовага набору, вырошчваецца каля 40 найменняў розных культур. «У нас шырока прадстаўлена лінейка зялёных культур у закрытым грунце: вырошчваецца кінза, розныя віды салатаў, кроп, зялёная цыбуля. Таксама практычна круглы год вырошчваем таматы і агуркі. Адзначу, што ў цэлым па годзе патрэба ў таматах (часткова) і агурках у Беларусі задавальняецца ў поўным аб'ёме», — заявіла Таццяна Гумянюк.

**Аб'ёмы прадукцыі, якія вырабляюцца, дазваляюць краіне ў поўнай меры ажыццявіць засыпанне насеннага фонду, закладку ў сховішчы сельгасарганізацый і ў стабілізацыйныя фонды, а таксама актыўна пастаўляць прадукцыю для рэалізацыі на рынках і кірмашах. Акрамя таго, задавальняецца патрэба і прамысловай перапрацоўкі.**

Гаворачы аб міжсезонным перыядзе, яна дадала, што тут патрэба насельніцтва ў таматах складае 19,2 тысячы тон, а ў агурках — 8,5 тысячы тон. «У гэтым годзе ў міжсезонны перыяд патрэба ў агурках будзе забяспечана. Гэта стала магчымым за кошт зрушэння тэхналагічных тэрмінаў вырошчвання. У лістападзе бягучага года мы плануем паставіць каля 1,5 тысячы тон агуркоў, што на 58 % больш, чым у мінулым годзе», — падкрэсліла Таццяна Гумянюк.



Пры гэтым яна звярнула ўвагу, што патрэба гандлю ў таматах у бягучым міжсезонным перыядзе будзе задаволена на 35 %. «Вытворчасць таматаў будзе штогод нарошчвацца. Неабходных аб'ёмаў плануецца дасягнуць за кошт мадэрнізацыі наяўных вытворчасцяў», — запэўніла спецыяліст Мінсельгасхарча.

## БЕЛКААПСАЮЗ РЭАЛІЗАВАЎ ПЕРАПРАЦАВАНАЙ ПРАДУКЦЫІ НА ТРЭЦЬ БОЛЬШ

Арганізацыі гэтага саюза ўжо сёлета экспартавалі бульбы на больш чым 500 тысяч долараў, паведаміла **начальнік упраўлення нарыхтовак «Белкаапсаюза» Аксана СКІНДЭР.**

Акрамя іншых кірункаў дзейнасці, «Белкаапсаюз» пастаўляе сваю прадукцыю на экспарт, у асноўным у расійскія рэгіёны. «Дынаміка гэтага года паказвае, што беларуская прадукцыя запатрабаваная. Мы адгружаем у Расійскую Федэрацыю бульбу, агародніну ў асартыменце, дзікарослыя ягады. Па шэрагу пазіцый у параўнанні з мінулым годам назіраецца рост на 10—15 %. Так, у нас ёсць рэзерв нарошчвання аб'ёмаў нарыхтовак і экспартнага патэнцыялу», — сказала Аксана Скіндэр.

Паводле яе слоў, сёлета Белкаапсаюз экспартаваў дзікарослых ягад на 440 тысяч долараў. «У апошнія гады пачала пашырацца лінейка экспартна арыентаванай харчовай перапрацаванай прадукцыі. Сёлета мы ўжо рэалізавалі яе на 516 тысяч долараў, што на 36 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. З улікам развіцця ў Расіі перапрацоўчай галіны спадзяёмся, што з кожным годам патрэба ў беларускай прадукцыі будзе ўзрастаць. Мы не плануем спыняцца на дасягнутых паказчыках, бо прадукцыя фермерскіх гаспадарак — адзін з галоўных экспартна арыентаваных сегментаў нашай краіны», — падкрэсліла начальнік упраўлення.

## ЗАМАРОЖАНЫЯ ЯГАДЫ — СВАЕ

Цяпер на сельскагаспадарчых кірмашах прадукцыя «Белкаапсаюза» прадаецца на 20—40 % танней, чым летась.

Па словах Аксаны Скіндэр, «Белкаапсаюз» штогод удзельнічае ў стварэнні стабілізацыйных фондаў на міжсезонны перыяд. «У нас паўсюдна арганізавана нарыхтоўчая сетка, куды насельніцтва можа прынесці сваю прадукцыю. Так, у нас дзейнічаюць больш за 760 прыёмазагатоўчых пунктаў. Пры гэтым у сезон масавых нарыхтовак арганізуецца работа звыш 860 пунктаў. У Беларусі ўдзельная вага нашых стабфондаў па шэрагу пазіцый займае ад 8 % да 10 %. Акрамя таго, у апошнія гады вялікая ўвага ўдзяляецца стварэнню ў стабфондах належных умоў для захавання якасці прадукцыі», — падкрэсліла спецыяліст.

Яна адзначыла, што цэны на плодаагародніную прадукцыю сталі больш даступнымі ў параўнанні з мінулым сезонам. Таксама Аксана Скіндэр падкрэсліла, што акрамя «баршчовага набору» сёння на сельскагаспадарчых кірмашах запатрабаваны дзікарослыя журавіны і грыбы. «Яшчэ дзякуючы лініям шокавай замарозкі мы пашыраем асартымент пладова-ягаднай прадукцыі. Сёння ў рознічнай гандлёвай сетцы сталі даступныя беларускія замарожаныя клубніцы, чарніцы, агрэст, маліны, ажыны і вішні. Гэты пералік пастаянна пашыраецца», — дадала яна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# АДЧУЦЬ МІНУЛАЕ З ТЭЛЕЭКРАНА

**На тэлеканале «Беларусь 1» 7 лістапада нас чакае тэлепрэм'ера гістарычнай драмы «На другім беразе».**

Кінастужка, знятая на кінастудыі «Беларусьфільм», ужо паспела паспяхова прайсці ў пракаце, а цяпер чакае сустрэчу з тэлеаўдыторыяй. Прэм'ерны паказ фільма адбудзецца ў аўторак на «першай» кнопцы. Нагадаем, дзеянне карціны дазваляе паглядзець на падзеі мінулага, калі наша краіна ў выніку Рыжскага дагавора была падзелена мяжой. Праз драматычныя гісторыі асобных сем'яў кінастужка паказвае жыццё беларусаў пад польскай акупацыяй, іх барацьбу за сваю культуру, веру і захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці.

Глядзіце «На другім беразе» 7 лістапада ў 21.55 на тэлеканале «Беларусь 1».

Прэм'ера

# Раздзяліць асалоду ад музыкі

**У апошнія дні кастрычніка Магілёў прымаў Міжнародны музычны фестываль «Залаты шлягер». Канцэрты і выставы, творчыя сустрэчы і маладзёжныя шоу-праграмы прайшлі на галоўных сцэнічных пляцоўках Прыдняпроўскага краю пад адкрытым небам. А здымачная група сацыякультурнага канала падрыхтавала для сваёй аўдыторыі тэлеверсіі асноўных канцэртных праграм.**

І ўжо ў гэтыя выхадныя тэлеаўдыторыя «Беларусь 3» зможа атрымаць асалоду ад любімых некалькімі пакаленнямі песень. Так, у рамках фестывалю было запісана пяць канцэртаў з удзелам беларускіх і расійскіх зорак эстрады і бардаў, сімфанічных і народных аркестраў. Першыя з іх убачым ужо заўтра ў эфіры. Так, 4 лістапада канал пакажа праграму ўрачыстага адкрыцця «Залатога шлягера» з удзелам знакамітых артыстаў Беларусі і Расіі. У канцэрце пачуем выступленні заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», заслужаных артыстаў Алены Ланской, Жанэт, Вольгі Ганчар, а таксама заслужаных артыстаў Расіі Ірыны Панароўскай і Сяргея Белікава, Таццяны Івановай і гурта «Комбинация», Аляксандра Дабранравава, ВІА «Лейся, песня», «Синяя птица» (Расія), Маура Менгалі (Італія) і іншых.

А 5 лістапада аматараў лірычнай песні чакае сольны канцэрт Аляксандра Драздова з легендарнага ВІА «Синяя птица». У выкананні многімі любімага артыста прагучаць хіты «Клён», «Кто тебе сказал?», «Синий иней», «Люди встречаются» і г. д. Не прапусціце паказ у нядзелю днём на сацыякультурным тэлеканале і сачыце за праграмай, бо працяг будзе.

**Алена ДРАПКО.**

# ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 184

Сваю новую задачу прапануе наш чытач Міхаіл Кошаль з Мінска *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Кра6, Фе1, Са7, Ch5, Ка4, Kf2, пс2 (7).
**Чорныя:** Крс4, Kd1, пп. b6, d5, g5 (5).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Задача Вячаслава Красічонка і Віктара Волчака атрымала першы прыз у міжнародным конкурсе Шахматнай федэрацыі Марока.

**Белыя:** Kpg8, Фb4, Лс4, Сс8, Кс3, Кс5, пп. d3, d6 (8).
**Чорныя:** Кре5, Лg5, Лh5, Са7, Kf3, Kf4, пп. а6, е3, е4, g4, g7, h7 (12).
Мат за 3 хады.

1. Фb7! ~ 2. Ф:е4+ Kpf6 3. Kd7x, 2...Кр:d6 3. Kb7x, 1...Лg6 2. Ф:е4+ Kpf6 3. Фе7x; 1...С:с5 2. Л:е4+ Kpf6 3. Фf7x, 2...Кр:d6 3. Фd7x, 1...Кр:d6 2. К:е4+ Кре5 3. Фс7x, 1... Kpf6 2. Фе7+ Крg6 3. Ф:g7x, 1...Kd2 2. d4+ Kpf6 3. Фf7x, 2...Кр:d6 3. Фd7x; 1...Лf5 2. Фе7+ Ке6 3. Л:е4x, 1...Ке6 2. Фd5+ Kpf4 3.Ке2x, 2...Kpf6 3. Ф:е6x

* * *

У Сочы з удзелам беларускіх зборных прайшлі камандныя чэмпіянаты Расіі па рапідзе і бліцы.

Наша мужчынская каманда ў рапідзе была шостая з 39 (+6-3=0), у бліцы — 16-я з 40 (+5-4=4). Гросмайстар Дзяніс Лазавік набраў у гэтых відах праграмы адпаведна 3 балы з 8 і 8,5 з 13, гросмайстар Міхаіл Нікіценка — 5 з 9 і 3,5 з 10, міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі — 5 з 9 і 5 з 10, майстар FIDE Максім Царук — 4,5 з 7 і 7 з 11, майстар FIDE Арцём Стрыбук — 1,5 з 3 і 3,5 з 7.

Жаночая беларуская зборная ў рапідзе была сёмая з 15 (+4-3=1), у бліцы — трэцяя з 14 (+8-2=3, бронзавыя медалі!). Майстар FIDE Варвара Палякова набрала адпаведна 3 балы з 8 і 6,5 з 13, майстар FIDE Аляксандра Тарасенка — 4,5 з 8 і 7 з 13, Ксенія Норман — 5,5 з 8 і 10,5 з 13, майстар FIDE Ксенія Зелянкова — 4,5 з 8 і 10 з 13.

* * *

У Мінску прайшоў буйны турнір па бліцы (больш за 100 удзельнікаў). Прызавую тройку склалі Яраслаў Навумовіч, Антон Шарамет і Арцём Бяляўскі. Сярод жанчын найлепшы вынік паказала Аляксандра Тарасенка, сярод ветэранаў — гросмайстар Ігар Люцко.

На дзіцячым чэмпіянаце свету ў Егіпце найлепшыя вынікі сярод беларусаў паказалі Дамір Булгак (5-е месца сярод хлопчыкаў да 10 гадоў) і Аляксандра Віцюк (10-е месца сярод дзяўчынак да 8 гадоў).

Прызавую тройку рэспубліканскай спартакіяды спартыўных школ склалі каманды з Магілёва, Мінска і Баранавіч.

Былая магілёўчанка Вольга Бадэлька падзяліла 2—4-е месцы ў суперфінале 73-га жаночага першынства Расіі — 7 балаў з 11.

Аляксей Аляксандраў заняў 8-е месца з 267 на Мемарыяле М. Чыгорына па бліцы ў Санкт-Пецярбургу. Андрэй Кавалёў быў пяты на турніры ў Будапешце.

У турніры па бліцы на сайце chess.com (577 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік заняў 17-е месца.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1.Kd3! Правільна адказалі Ігар Ананіч, Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Барыс Маркін, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльнук.

Міхаіл Кошаль прапануе сваю варыяцыю гэтай задачы.

**Белыя:** Kpb5, Лg4, Cf8, Кс6, Ке5, пп. с2, f5 (7).
**Чорныя:** Kpd5, Са5, Kb2, пп. d2, е4 (5).
Мат за 2 хады.

Рашае 1.Kd3! Не вядзе да мэты 1.Kd7? Cd8! або 1.Kg6? Сс7!

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# СПЯВАЮЦЬ УСЕ!

**Праекты, дзе таленавітыя людзі могуць паказаць сябе, заўсёды выклікаюць цікавасць аўдыторыі. Іх удзельнікі адкрываюцца гледачам з новых ракурсаў, а вось прыхільнікі знаходзяць натхненне ў вобразах і музычным матэрыяле канкурсантаў, адкрываюць для сябе новыя імёны. Расказваем, дзе гэтай восенню можна назіраць за такога кшталту спаборніцтвамі.**



Пра «Фактар.Ву» мы ўжо пісалі. Трэці сезон шоу зноў традыцыйна заваёўвае пятнічны эфір на тэлеканале «Беларусь 1», збіраючы каля экранаў сотні тысяч гледачоў. Так, у мінулую пятніцу за адборамі канкурсантаў назірала 700 тысяч чалавек. На тэлеканале АНТ стартавала шоу «Зорны шлях», дзе за сваё месца ў сцэнічна-музычнай галактыцы зноў змагаюцца людзі розных узростаў і прафесій з усёй краіны.

Калі ж праграмамі кшталту згаданых вас ужо не здзівіць і вы, напрыклад, прыхільнік advertising оперна мастацтва, то дакладна з цікавасцю паглядзіце праект «Вялікая опера» на канале «Расія-Культура». Пры падрыхтоўцы да новага сезона арганізатарамі было прагледжана больш як трыста заявак, а пасля праслухоўвання да конкурсу дапусціці дзясятак лепшых. У першым выпуску 4 лістапада гэтыя 10 удзельнікаў, якія прадстаўляюць вядучыя тэатры Расіі і краін бліжэйшага замежжа, выйдуць на сцэну, каб прадэманстраваць свае таленты. Будуць там і беларускія артысты — Ірына Мулярчык (сапрана) і Дар'я Гаражанка (меца-сапрана). У праграме прагучаць творы Джузэпе Вердзі, Джакама Пучыні, Умбэрта Джардана і іншых прадстаўнікоў італьянскай оперы. Ацэньваць майстэрства канкурсантаў будзе аўтарытэтнае журы, у склад якога ўвайшлі народны артыст Расіі Дзмітрый Бертман, Медэя Ясанідзі (Грэцыя-Расія), Марка Баэмі (Італія) і заслужаная артыстка Расіі Марына Мешчаракова. Наступныя выпускі праграм будуць прысвечаны ўжо рускай оперы, апэрэце, музыцы Вердзі, рамансам Рахманінава, а таксама рускаму рамансу і арыі. Не прапусціце эфір з прэм'ерай у суботу днём.

А на тэлеканале «НТБ-Беларусь» убачым новы сезон музычнага шоу «Суперстар». У ім суперзоркі 80—90-х і нулявых зноў вяртаюцца. І ў чацвёртым сезоне за званне найлепшага будуць змагацца заслужаныя артысты Расіі Кай Метаў, Аляксей Глызін і Фелікс Цэрыкаці, а таксама Кацярына Суржыкава, спевакі Аляксей Гоман, Ігар Наджыеў, Таццяна Маркава, Ліка Стар і Ларыса Чэрнікава. Кампанію ім складзе і салістка гурта «Ліцэй» Анастасія Макарэвіч. Кожнаму з удзельнікаў з выпуску ў выпуск патрэбна будзе прымяраць на сябе розныя амплуа і выносіць тое на суд гледачоў. Распачнуць яны свой шлях на праекце традыцыйна з выканання хіта, які стаў візітоўкай для іх. А ацэньваць кожнае з выступленняў будзе зорнае журы ў складзе Сяргея Саседава, Леры Кудраўцавай, Наташы Каралёвай і Стаса П'ехі.

Пры жаданні ўбачыць штосьці зусім новае ў нядзелю тут жа не прапусціце выпуск новага сезона высокатэхналагічнага «Шоу Аватар». У другім сезоне арыгінальнага праекта НТБ кожную нядзелю мы зможам назіраць як змешваюцца фізічны і віртуальны свет, а на сцэне, дзякуючы іннавацыйным тэхналогіям, з'явяцца 12 лічбавых аватараў — герояў казак і мультфільмаў, але ў сучасным прачытанні. Голас, рухі і нават міміка ім дастануцца ад рэальных людзей — папулярных прадстаўнікоў сферы музыкі, кіно і тэлебачання. А вось задачай для зорнага журы будзе здагадацца, хто з іх зорных калег кіруе сваім «лічбавым я». Вядучым новага сезона па-ранейшаму будзе Вячаслаў Макараў. Глядзіце 5 лістапада ў вячэрнім тэлеэфіры.

**Алена ДРАПКО.**


## Са «Звяздой» — спадручней!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або на I паўгоддзе 2024 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 15 студзеня 2024 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.



Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем тостараў Holt HT-ET-003 і суперпрыз — мікрахвалевая печ Horizont 20MW700-1378AAW. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 26 студзеня 2024 года.



## Беларусь 5

**6.55** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — ХК «Сочы».
**8.55** Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. «Карынціянс» — «Атлетыка Мінэйра».
**10.55** Канькабежны спорт. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.
**11.55** Хакей. Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Фінал.
**15.50** Хакей для ўсіх.
**16.20** Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — «Чырвоная армія». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**18.40** Планета спорту.
**19.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — ХК «Сочы». У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**21.25** Гандбол. СЕХА-Ліга. «СКА-Мінск» — «Бусел Кітая».
**23.00** Самба. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**0.35** Піт-стоп.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Маё роднае. Грошы» (12+).
**12.20, 13.15, 23.25 Фільм «У гадзіну бяды» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30** «Трывожная кнопка» (16+).
**18.20** «Народны ДАСТ» (12+).
**19.00** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**19.05** «Поле цудаў» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.15** «Лаўроў. За гранню» (16+).
**21.25 Фільм «Дама трэф» (12+).**
**1.20** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект. Без падману (16+).
**10.40 «Варона». Серыял (16+).**
**11.35** Дак. праект. Таямніцы космасу (12+).
**13.50** Дак. праект. Неверагодная навука (12+).
**16.50** «Рашэнне ёсць. Дэпутацкі адказ».
**17.20** Дак. праект. Закрыты архіў (12+).
**17.45 «Чужая асоба». Серыял (16+).**
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**20.40** «Крокі Незалежнасці».
**20.55 «Алекс Люты». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».
**0.50 «Дзяржаўная граніца. На далёкім пагранічча» (12+).**

## МІР

**5.00 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**6.35, 1.00** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**7.30, 11.05, 14.10, 16.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**8.30, 12.05, 15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**10.10, 13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**17.35** «Міравое пагадненне» (16+).
**18.50** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**19.30 Маст. фільм «Вяртанне «Святога Лукі» (16+).**
**21.30 Маст. фільм «Чорны прынц» (16+).**
**23.25 Маст. фільм «Версія палкоўніка Зорына» (16+).**
**2.55** Мультфільмы (6+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**10.05 Тэлесерыял «Таямніцы следства» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40 Серыял «Марозава» (16+).**
**18.45** «Прамы эфір» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Тэрмін даўнасці» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.05, 8.20, 13.20, 22.55, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.20** Гісторыі выратавання (12+).
**7.50** Беларусь стваральная (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.10, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**12.25** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «За гранню» (16+).
**15.00** «Чакай мяне» (12+).
**16.35, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.50 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).**
**21.20** «НЗ.by: час вынікаў».
**23.00, 23.45 Серыял «Балабон» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 21.00** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35** «Рэтраспектыва».
**9.10** «Раманавы».
**10.00** «Любімае кіно».
**11.30 Серыял «Дрэва з глыбокімі каранямі».**
**12.45 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**13.30 Меладрама «Дарэлы».**
**15.05 Камедыя «Праблемы з монстрам» (12+).**
**16.55, 19.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**17.00 Драма «Карона» (16+).**
**19.05 Драма «На зломе эпох» (18+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Урокі Лазуркіна».
**21.10 Трылер «Рэптыліі» (16+).**
**23.35** «Начны серыял».



## ВТБ

**6.00, 7.55, 9.45** Мультфільмы (6+).
**6.30, 10.10** «Лаві момант» (16+).
**6.50, 8.40, 10.30** Маст. фільм «Апошнае лета дзяцінства» (12+).
**8.20** «Лаві момант» (16+).
**11.30, 18.00, 21.00** Серыял «Таты дочкі» (12+).
**14.00, 1.00** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**16.00, 23.00** Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
**18.30, 21.30** Серыял «Галя, у нас адмена!» (16+)
**19.00, 22.00** Серыял «Мама будзе супраць» (16+).
**20.00** Серыял «Філатаў» (16+).
**2.00** «6 кадраў» (12+).
**4.00** «Даеш моладзь!» (16+).
**5.00** «Адна за ўсіх» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05, 15.15** Прыступкі цывілізацыі.
**7.55** «Почырк эпохі».
**8.25** «Жыццё і лёс» (субцітры).
**8.45, 22.15** «Без права на літасць». Фільм.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.10** ХХ стагоддзе.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** «Доктар Вараб'ёў. Перачытваючы аўтабіяграфію». Дак. серыял.
**13.35, 13.55, 14.15, 0.10, 0.30, 0.50** «Порус». Тэлесерыял.
**14.35** «Штучны адбор».
**16.10** «Белая студыя».
**17.15** «Мікіта Далгушын. Казка яго жыцця». Дак. фільм.
**17.45, 2.20** Гістарычныя канцэрты.
**18.35** Шэдэўры «Цэнтрнавучфільма».
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Абсалютны слых».
**21.30** Улада факта.
**23.15** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**23.30** Дак. камера. «Акцёр як твар часу».

## Настальгія

**6.00** «СевАлогія» (18+).
**7.00** «Ад смешнага да вялікага. Аркадзь Арканаў» (16+).
**7.40** Маст. фільм «Давайце зробім гэта легальна» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.35, 12.50, 14.35, 15.40, 17.15, 21.40, 23.40, 1.10, 2.50, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 16.40, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Быў час» (16+).
**13.00** Маст. фільм «Прыгажосць д'ябла» (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**19.15** Маст. фільм «Жоўтае неба» (16+).
**0.00** Маст. фільм «Шчаслівы рэйс» (12+).
**1.20** «Брава, Артыст!» (16+)

## EuroSport 1

**3.30, 8.00** Веласпорт-трэк (6+).
**5.00, 9.30, 10.30, 15.30, 21.30, 1.30** Снукер (6+).
**7.00, 19.00** Аўтагонкі на вынослівасць (6+).
**14.00** Парусны спорт (6+).
**14.30** Велакрос. Жанчыны (6+).
**15.00, 20.00** Велакрос. Мужчыны (6+).
**20.30, 21.00** Горныя лыжы. Жанчыны (6+).
**23.00** Дзюдо (6+).
**0.00** Каратэ (6+).
**1.00** Велакрос (6+).

## Кінакамедыя

**1.05** «Булкі» (16+).
**3.00** «У чаканні цуду» (12+).
**4.50** «Я худзею» (16+).
**6.45** «Бабро пархалавaць» (16+).



**8.50** «Шосты элемент» (16+).
**10.40** «Выдатніца лёгкіх паводзін» (16+).
**12.20** «Выкідала» (18+).
**13.55** «Выпускны» (18+).
**15.50** «Нянькі» (12+).
**17.35** «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі» (12+).
**19.30** «Утаймаванне свавольнага» (16+).
**21.30** «Хлопчык у дзяўчынцы» (16+).
**23.15** «Мядовы месяц у Лас-Вегасе» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусфільма» (12+).
**9.05** «Знахаркі» (16+).
**10.00, 16.00** «Любоўная магія» (16+).
**11.00** «Перыскоп» (16+).
**11.20, 17.00** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**13.05, 18.50** «Сляпая» (16+).
**14.30, 20.15, 3.45** «Варажбітка» (16+).
**21.45** «Правінцыйны дэтэктыў» (16+).
**23.25** «Другі зрок» (16+).
**0.25** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.20** «Троя» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.40** З мяне хопіць (16+).
**7.45** Ціхая гавань (12+).
**10.05** Лепшае ўва мне (12+).
**12.20** Тутсі (16+).
**14.40** Красуні (12+).
**16.35** Чаго хочуць жанчыны (16+).
**19.00** Усё магу! (16+).
**20.40** Падарожжа Гектара ў пошуках шчасця (12+).
**23.00** Д'ябал і Дэніэл Уэбстэр (16+).
**1.00** Джэры Магуайер (16+).
**3.10** Малая на мільён (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Пін-код (6+).
**6.35** Фіксікі (6+).
**7.25** Смяшарыкі (6+).
**8.10** Усё і адразу (16+).
**10.00** Карпаратыў (16+).
**11.40** Суперменеджар, або Матыга лёсу (16+).
**13.10** Атэль «Бялград» (12+).
**15.10** Нявеста любой цаной (16+).
**17.00, 17.55** Ганна-дэтэктыў (12+).
**18.55** Непаслухмяны (18+).
**21.10** Кухня ў Парыжы (12+).
**23.10** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**1.15** All inclusive, або Усё ўключана! (16+)
**2.50** Шчасця! Здароўя! (16+)
**4.10** Адной левай (12+).

## National Geographic

**6.05** Выкананне жадання: найноўшы круізны лайнер Disney (16+).
**7.10, 7.55, 8.40, 9.30** Мегазаводы (16+).
**10.15, 11.00, 23.20, 0.10** Асушыць акіян (16+).
**11.50, 12.30, 13.15** Самыя лепшыя суперкары (16+).
**14.00, 21.05, 21.50, 22.35** Неймаверныя будынкі з Дэніэлам Эшвілам (16+).
**14.45, 15.35, 16.25, 2.25, 3.15, 4.05, 4.55** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**17.15, 18.00, 18.45, 19.30, 20.20** Неверагодныя цуды тэхнікі (16+).
**0.55, 1.40** Індустрыя наркотыкаў (18+).
**5.40** Навуковыя глупствы (16+).

## ЯСНАе

**4.05** Серыял «Люты-2» (16+).
**5.55** Серыял «Лёс дыверсанта» (12+).
**7.35** «Раніца ЯСНАЯ».
**8.40** Серыял «Сёмая сімфонія. Фільм 1. Блакада» (16+).
**10.30** Серыял «Афіцэры-2» (12+).
**12.15** Серыял «Моцная браня» (12+).
**14.05** Серыял «Былых не бывае» (16+).
**15.55** Серыял «Рыкашэт» (16+).
**17.40** Маст. фільм «Снайпер» (16+).
**19.20** Серыял «Сляпы-2» (12+).
**21.00** Дак. цыкл «Сувязісты».
**21.25** Дак. серыял «Хронас».
**22.00** Маст. фільм «Перавозчык: спадчына» (16+).
**23.35** Маст. фільм «Гісторыя аднаго прызначэння» (12+).
**1.30** Серыял «Немец» (16+).
**3.00** Маст. фільм «Мяне завуць Арлекіна» (16+).



*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

чацвер, 9 лістапада ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.40** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.00, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «Фамільнае гняздо» (12+).**
**10.55, 1.15** «Скажынемаўчы».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25, 22.20 Серыял «След» (16+).**
**17.05** Беларуская часінка.
**18.30, 19.20 Меладрама «Святлана» (12+).**
**20.50** «Фактар.BY».
**21.00** Панарама.
**21.45** Беларуская суперканчына.
**21.55** Адзін дзень (12+).
**0.20** Сфера інтарэсаў.
**0.55** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 21.05** Тэлебарометр.
**10.05, 20.15** «Сляпая» (16+).
**10.35, 18.40 Дэтэктыў «Свае» (16+).**
**12.10** Я з вёскі (12+).
**12.40, 21.15 Дэтэктыў «Кулагіны» (16+).**
**14.30 Серыял «Бедны алігарх» (16+).**
**15.35** Мультсерыял «Маша і Мядзведзь» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**16.55 Серыял «#Яжбацька» (16+).**
**17.50** «Чорны спіс» (16+).
**20.40 Драма «Знакі лёсу» (16+).**
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**23.15** «На нажах» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 16.10, 20.30, 0.15** «Навіны культуры».
**8.15, 18.40 «Лета ваўкоў». Маст. фільм (16+).**
**10.05** «Сэнс жыцця».
**10.30, 16.20 «Ціхі Дон». Маст. фільм (12+).**
**13.10** «Жывая спадчына».
**13.35 «Карона Расійскай імперыі, ці Зноў няўлоўныя». Маст. фільм (12+).**
**15.55** «Архітэктура Беларусі».
**18.15** «Спецыяльны культурны рэпартаж».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Бег». Маст. фільм (12+).**
**0.25** «Легенды эстрады».

## Беларусь 5

**6.55** Плаванне. Чэмпіянат Беларусі. Брэст.
**8.55** Між іншым.
**9.15** Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. «Амерыка Мінейра» — «Карыціба».
**11.15** Слэм-данк.
**11.50** Хакей. Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Расія (U-16) — Казахстан (U-18).
**14.00** Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. «Інтэрнасьёнал» — «Флуміненсе».
**15.50** Хакей. Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Жаночая зборная Расіі — Беларусь (U-18).
**18.05** Піт-стоп.
**18.20** «Спорт-цэнтр».
**18.30** Хакей для ўсіх.
**19.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — ХК «Сочы». У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**21.30** Гандбол. СЕХА-Ліга. «Мяшкоў-Брэст» — ЦСКА (Масква).
**23.00** Плаванне. Чэмпіянат Беларусі.
**0.50** Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. «Гаяс» — «Сантас».

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+).
**11.25** «Маё роднае дзяцінства» (12+).
**12.35, 13.15, 22.30 Фільм «У гадзіну бяды» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**20.00, 0.25** Час.
**21.15 Фільм «Троцкі» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект. Без падману (16+).
**10.40 «Варона». Серыял (16+).**
**11.35** Дак. праект. Таямніцы космасу (12+).
**13.50 «Дыназаўр-2». Серыял (16+).**
**16.50 «Чужы твар». Серыял (16+).**
**20.15, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**20.40** «Беларуская суперканчына».
**20.50 «Алекс Люты». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».
**0.50 «Дзяржаўная граніца. Салёны вецер» (12+).**

## МІР

**5.00, 2.35 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**5.45** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**6.25, 10.10 Тэлесерыял «Страсці па Чапаю» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 18.30, 2.05** Навіны.
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.35** «Міравое пагадненне» (16+).
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.40** «Назад у будучыню» (16+).
**22.30** «Сусветныя гульні розуму» (16+).
**23.05 Маст. фільм «Выпрабавальны тэрмін» (16+).**
**0.50** «Народжаны ў СССР» (16+).
**1.20** Дак. фільм «Міхаіл Калашнікаў. Я — легенда» (16+).
**2.20** [Не]Фантастыка (12+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**10.05 Тэлесерыял «Таямніцы следства» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Так! Але...»
**12.20** «Пра самае галоўнае» (12+).
**13.00** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40 Серыял «Марозава» (16+).**
**18.45** «Малахаў» (16+).
**21.30 Тэлесерыял «Кацярына. Фаварыты» (16+).**
**22.30, 23.15 Тэлесерыял «Жыццё пасля жыцця» (18+).**
**23.45** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.05, 8.20, 13.20, 22.45, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.20** Гісторыі выратавання (12+).
**7.50** Беларусь ствбральная (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.25** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.10, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**12.25** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.35, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.45 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).**
**22.50, 23.45 Серыял «Балабон» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 21.15** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35** «Рэтраспектыва».
**9.10** «Раманавы».
**10.00** «Любімае кіно».
**12.20 Серыял «Дрэва з глыбокімі каранямі».**
**13.25 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**14.15 Меладрама «Дарэлы».**
**15.50 Меладрама «Вікторыя і Абдул» (16+).**
**17.45, 19.45** «Надвор'е» + «Эрана».
**17.50 Драма «Карона» (16+).**
**19.50 Драма «На зломе эпох» (18+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.00** «Асалам алейкум, Беларусь!»
**21.10** «Урокі Лазуркіна».
**21.25 Трылер «Тры дні на ўцёкі» (16+).**
**23.35 Фантастыка «Стваральнік» (16+).**
**1.50** «Любімае кіно».

## ВТБ

**6.00, 7.50, 9.40** Мультфільмы (6+).
**6.30, 8.15, 10.05** Праграма «Лаві момант» (16+).
**6.50, 8.35, 10.25** Маст. фільм «Тры вясёлыя змены» (6+).
**11.30** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**14.00, 1.00** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**16.00, 23.00** Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
**18.30, 21.30** Серыял «Галя, у нас адмена!» (16+)
**19.00, 22.00** Серыял «Мама будзе супраць» (16+).
**20.00** Серыял «Філатаў» (16+).
**21.00** Серыял «Татавы дочкі. Новыя» (16+).
**2.00** «6 кадраў» (12+).
**4.00** «Даеш моладзь!» (16+).
**5.00** «Адна за ўсіх» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05, 15.15** Прыступкі цывілізацыі.
**8.00** «Почырк эпохі».
**8.25** «Жыццё і лёс» (субцітры).
**8.45** «Без права на літасць». Фільм.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.10** ХХ стагоддзе.
**11.45** «Андрэй Тупалеў». Дак. фільм.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** «Доктар Вараб'ёў. Перачытваючы аўтабіяграфію». Дак. серыял.
**13.35, 13.55, 14.15, 0.10, 0.30, 0.50** «Порус». Тэлесерыял.
**14.35** «Абсалютны слых».
**16.10** «Свет Аляксандры Пахмутавай». Дак. фільм.
**17.15** «Мая любоў — Расія!»
**17.45, 1.50** Гістарычныя канцэрты.
**18.50** Шэдэўры «Цэнтрнавучфільма».
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Адкрытая кніга.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Месца сустрэчы змяніць нельга». Жыццё пражыў не дарэмна». Аўтарскі фільм Аляксандра Казакевіча.
**21.30** «Энігма. Аіда Гарыфуліна».
**22.15** «Салдаты ў сініх шынялях». Фільм.
**23.30** Дакументальная камера.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**6.50, 8.35, 9.40, 11.15, 15.40, 17.40, 18.50, 20.40, 21.40, 23.35, 3.40, 5.35** Музычная настальгія (12+).
**7.00** Маст. фільм «Прыгажосць д'ябла» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**10.40, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.15** Маст. фільм «Жоўтае неба» (16+).
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
**19.05** Маст. фільм «Улюбёнец новага Арлеана» (16+).
**0.00** «СевАлогія» (18+).
**1.00** «Ад смешнага да вялікага. Аркадзь Арканаў» (16+).
**1.40** Маст. фільм «Давайце зробім гэта легальна» (16+).

## EuroSport 1

**3.30, 8.00, 0.30** Велаcпорт-трэк (6+).
**5.00, 9.30, 10.30, 15.30, 21.30, 1.30** Снукер (6+).
**7.00, 14.00, 20.30** Лёгкая атлетыка (6+).
**19.00** Велакрос. Жанчыны (6+).
**19.30** Велакрос. Мужчыны (6+).
**23.30, 0.00** Горныя лыжы. Мужчыны (6+).

## Кінакамедыя

**1.05** «Каханне і монстры» (16+).
**3.00** «Шпіён па суседстве» (12+).
**4.45** «Сястрычка Бэці» (16+).



**6.50** «Самы Новы год!» (16+)
**8.20** «Родныя» (18+).
**10.10** «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі» (12+).
**12.00** «Бландзінка ў законе» (12+).
**13.50** «На кручку!» (16+)
**15.30** «Утаймаванне свавольнага» (16+).
**17.30** «Копы ў глыбокім запасе» (16+).
**19.30** «Забойныя канікулы» (18+).
**21.05** «Выдатніца лёгкіх паводзін» (16+).
**22.45** «Паміж намі, хлопчыкамі» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.05** «Знахаркі» (16+).
**10.00, 16.10** «Любоўная магія» (16+).
**11.00** «Паглядзім» (12+).
**11.30, 17.10** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**13.15, 19.00** «Сляпая» (16+).
**14.40, 20.25, 4.00** «Варажбітка» (16+).
**21.55** «Піяністка» (16+).
**1.15** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**2.10** «Другое жыццё Уве» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.30** Падарожжа Гектара ў пошуках шчасця (12+).
**7.40** Усё магу! (16+)
**9.20** Малая на мільён (16+).
**11.55** Гонка (16+).
**14.15** Джэры Магуайер (16+).
**17.00** Д'ябал і Дэніэл Уэбстэр (16+).



**19.00** Там, дзе сэрца (16+).
**21.20** Лісты да Джульеты (12+).
**23.25** Пенелопа (12+).
**1.20** Клятва (16+).
**3.00** Красуні (12+).
**4.25** Сэрцаедкі (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Пін-код (6+).
**6.20** Фіксікі (6+).
**6.45** Смяшарыкі (6+).
**7.20** Шчасця! Здароўя! (16+)
**8.55** 30 спатканняў (16+).
**10.40, 3.20** Манах і чорт (12+).
**12.50** Кухня ў Парыжы (12+).
**14.50** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**17.00, 17.55** Ганна-дэтэктыў (16+).
**18.55** Авантурысты (12+).
**20.45** Краіна цудаў (12+).
**22.20** Дзяўчына з касой (16+).
**0.05** Дзед Мароз. Бітва чараўнікоў (6+).
**2.05** Элефант (12+).
**5.10** Кот у ботах (6+).

## National Geographic

**6.20** Суперзбудаванні (16+).
**7.05, 7.55, 8.45, 9.30** Мегазаводы (16+).
**10.20, 11.05, 23.15, 0.00** Асушыць акіян (16+).
**11.50, 12.35** Пагранічная ахова Іспаніі (16+).
**13.25, 14.10, 17.20, 18.05, 18.45, 19.30, 20.15, 21.00, 21.45, 22.30** Наркабароны: захоп (16+).
**14.50, 15.40, 16.30, 2.15, 3.05, 3.55, 4.45** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**0.45, 1.30** Індустрыя наркотыкаў (18+).
**5.30** Навуковыя глупствы (16+).

## ЯСНАе

**5.10** Серыял «Ялта 45» (12+).
**6.50** Серыял «Лёс дыверсанта» (12+).
**8.35** «Ясна аб футболе».
**9.05** Серыял «Сёмая сімфонія. Фільм 2. Канцэрт» (16+).
**10.55** Серыял «Вікінг» (16+).
**12.30** Серыял «Моцная браня» (12+).
**14.15** Серыял «Крэпасць Бадабер» (16+).
**16.00** Серыял «Рыкашэт» (16+).
**17.40** Серыял «Шэф» (16+).
**19.20** Серыял «Спадары афіцэры» (16+).
**21.00** «У адкрытым доступе».
**21.30** «PROфутбол».
**21.50** Маст. фільм «Крyты» (16+).
**23.20** Маст. фільм «13-ы раён» (16+).
**0.45** Серыял «Немец» (16+).
**2.15** Маст. фільм «Палігон» (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




## ПАЧАТАК ВЯЛІКАГА ШЛЯХУ

Гэта гісторыя ўжо досыць даўняя: недзе ў сярэдзіне 90-х два калгасныя шафёры сабраліся ў камандзіроўку ў горад.

«Сарафаннае радыё» тут жа разнесла гэту навіну па вёсцы, і на мужчын пасыпаліся заказы. Хтосьці прасіў завезці дзецям гасцінцаў, хтосьці — нешта купіць, здаць у рамонт тэлевізар... Іван з Міколам нікому не адмаўлялі, бо вяскоўцы — народ дружны: сёння ты чалавека паслухаеш — заўтра ён цябе ўважыць...

Дзядзька Аляксей — запыханы — прыбег да машыны перад самым ад'ездам:

— Хлопчыкі, выручайце! З каровай бяда. Можа, спужалася чаго ці дрэнным вокам хто паглядзеў?.. Не есць і ўсё! А ветэрынар — ніякай хваробы не бачыць... Дык мне параілі да шаптухі адной звярнуцца, яна ваду загаворвае. Вось адрас, хлопчыкі, вось бутэлька... Вам жа якраз па дарозе. Дык не адмоўце — вазьміце вады!

— Ну чаму ж не ўзяць? — сказаў Іван, хаваючы за сядзенне бутэльку, а ў кішэнь — паперку з адрасам. — Але ж жанчыне трэба заплаціць.

— От жа... Спяшаўся, браткі: не паспеў з грашы ўзяць. Дык вы ўжо са сваіх разлічыцеся. А прыедзеце — я аддам.

«Браткі» пераглянуліся (ведалі, што ў дзядзькі снегу зімой не возьмеш), але ж прамаўчалі. Хіба, ужо крануўшыся, Іван уздыхнуў:

— Не мела баба клопату...

— Ды ўжо ж, — падтрымаў Мікола. — Аддасць ён грошы... Трэ было нияк адмовіць.

...Назад сябрукі вярталіся ў добрым гуморы, бо і справы калгасныя ўладзілі, і гасцінцаў дзецям купілі, пра жонак ды аднавяскоўцаў сваіх не забылі...

— Ваня, — досыць рэзка тармазнуў Мікалай, — мы ж вады карове не ўзялі! І вёску тую праехалі. Трэба назад вяртацца?

— Ты звар'яцеў? Кіламетраў дваццаць туды, дваццаць назад! І не думай!

— А што тады дзядзьку скажам? Што знахаркі дома не было?

— Не, пачакай.

Іван дастаў бутэльку і трохлітровы слоік з-пад выпітага кампоту — выскачыў з машыны. У прыдарожнай канаве (дождж нядаўна прайшоў) набраў у посуд вады...

— Вось, дзядзька, лекі для тваёй кароўкі, — сказаў пасля гаспадару. — Вадой з бутэлькі будзеш на рагулю пырскаць, а са слоіка — паіць — пакрысе... Запомніў?

— А як жа, хлопцы! Дзякуй вам! А грошы, — дзядзька запнуўся, — я потым аддам. Цяпер нямашака.

— Ды бог з імі, з грашыма, — махнуў рукою Іван. — Абы дапамагло.

...Праз тыдзень ён ужо расказваў Міколу, што сустрэў Аляксея, што каroўка ў таго здаровая: папраўілася! Ад першага ж разу!

— Дык, можа, ну яго, гэта шафёрства, Іван? Давай будзем ваду замаўляць, скаціну лячыць, — прыжмурыў вока Мікалай.

— А што — можна паспрабаваць, — гэтак жа сур'ёзна адказаў Іван, і абодва зарагаталі.

**А. Навасельская,**
*Мінскі раён.*

## ТАКОЕ ШЧАСЛІВАЕ ПЛАВАННЕ...

Людзям маладым уласціва марыць, людзям пажылым — успамінаць мінулае.

Пасля першага курса інстытута (хіміка-біялагічны факультэт) мы праходзілі так званую палявую практыку ў вёсцы Полцева: пад кіраўніцтвам выкладчыкаў рыхтавалі гербарыі па батаніцы, калекцыі па заалогіі, вялі назіранні з гнездаваннем птушак... Жылі ў вялікіх намётах каля вясковай школы, штодня па два чалавекі дзяжурылі па кухні.

...У той дзень была наша чарга, і снеданне мы з Валей ужо «адбылі». На абед на дваццаць з лішкам галодных, якія разам з выкладчыкам пайшлі вывучаць флору і фаўну роднай Беларусі, наварылі шчаўя. Атрымалася недзе з вядро ў вялізнай каструлі.

Але ж зварылі і разгубіліся: на двары — спякота, а ў нас яшчэ і страва гарачая. Што рабіць? Мы з Валяй тую каструлю за «вушкі» і да Дзвіны. Прынеслі на бераг, «укапалі» ў пясок каля самай вады, а самі ў гэтыя час паскідалі сукенкі, зайшлі ў раку, працягваем размову... Пра што? Ну, вядома ж, пра сваё, дзявочае. Валя скардзіцца, што Лёня пры ёй толькі чырванее ды заікаецца: не, каб пра каханне сказаць... Я разважаю, што будзе далей, калі ўсё ж такі скажа? У загс ісці як быццам ранавата?

Пытаюся так і ў тое ж імгненне бачу, што каструлі на месцы, дзе прыкапалі, няма — знікла! Глянулі на Дзвіну — плыве!

Валя адразу ў пісk, бо плаваць не ўмее, а я — у ваду і давай даганяць.

Не ведаю, адкуль, але ж раптам з'явіўся Лёня. Ён таксама кінуўся ў ваду, падобна — каб ратаваць мяне, бо так зразумеў крык Валі.

— Я ў парадку! Даганяй каструлю! — загадваю хлапцу, спрабуючы стаць на дно. Ды дзе там — глыбіня, параходы ходзяць...

На шчасце, Лёня пачуў мяне — «штурхае» каструлю перад сабой, плыве да Валі. Я — на спіне — следам за ім... Але ж бачу, што непадалёк — чыясьці галава, далей — яшчэ адна, і тая дальняя гоніцца за той, што плыве за мной, якая ў сваю чаргу стараецца дагнаць мяне. Нічога не разумею: навошта? Я ж не таплюся! Крычу так, а «галовы» нібы не чуюць.

Рэчка робіць зігзаг, і дальняга чалавека я ўжо не бачу. Затое наперадзе — наша пясчаная каса, на ёй — людзі: глядзяць у мой бок, крычаць: «Давай!», «Хутчэй!»...

Даплываю, выходжу з вады (следам — нашы Ніна з Лідай), а насустрач — фізрук... З секундамерам.

— Ну ты малайчына! — хваліць мяне. — А казалі, што дзяжурыш па кухні, што табе не да спаборніцтваў...

Толькі тут я пачынаю разумець, што трохі вышэй ад месца, дзе мы з Валяй «прыкопвалі» каструлю са шчаўем, знаходзіўся старт, што Ніна і Ліда змагаліся за перамогу, а тут раптам я...

Прыйшлося патлумачыць, адкуль узялася.

А перад вячэрай яшчэ і Лёня прызнаўся, што калі «лавіў» каструлю, — зачарпнуў ёй трохі вады.

Аднак шчаўе ўсе са смакам з'елі, і чаргі ў маленькі домік, на шчасце, не было.

**Зоя Наваенка,**
*г. Глыбокае.*

## ВУЧЫСЯ, НЯБОЖА, ВУЧЭННЕ ПАМОЖА

Нявестку маёй сяброўкі завуць Васілісай. Я ж заву яе Васькай, як суседскага дачнага ката, бо мне яны абодва, мякка кажучы, не вельмі сімпатычныя: кот так і цікуе, каб прашмыгнуць у дом ды сцягнуць нешта з ежы, а Васіліса...

Калі пра яе заходзіць размова, сяброўка хіба цяжка ўздыхае ды напамінае, што свякруха павінна быць на адно вока слепаватая, на адно вуха глухаватая, то-бок шмат чаго не бачыць, шмат чаго не чуць.

А я ж дык зусім не такая: я ў абодва бачу, у абодва чую і ведаю, што нявестка ў Любы вельмі «эканомная»: усё па зніжках купляе... (Дарэчы, нядаўна — яшчэ адно футра з норкі. Па акцыі... Сабе)

Што свекрыві?

Неяк вечарам я да яе на кубак гарбаты зайшла. Бачу, на палічцы нейкія «дзікія» рэчы стаяць (Люба ніколі такіх не купіла б!): тры аднолькавыя сувенірныя талеркі з выявай зубра, дзве свечкі ў металічнай гільзе... А найболей здзівіла невялікая пластмасавая штучка — на клізму падобная. Пытаю ў сяброўкі, што гэта? Яна, бедная, толькі плячыма паціснула:

— Нявестка на юбілей падарыла. Можа, рэч і патрэбная, але ж я не ведаю, для чаго. Наклейка ўнізе амаль што сцерлася.

З дапамогай лупы прачыталі «Цы...іца». Трэба разумець (я часта рэбусы разгадваю), — цыбульніца? Для захоўвання толькі адной?.. (Больш проста не змесціцца.)

— Доранаму каню ў зубы не глядзяць, — тлумачыць Люба і прызнаецца, што пасля нявестчыных падарункаў часам месца сабе не знаходзіць.

— Во, паглядзі, — кажа яна і выцягвае з шафы дзве адзежыны. — Гэтую сукенку Васіліса мне на Новы год падарыла, а гэты пінжак — на 8 Сакавіка... Не мае ж фасоны і колеры, нават памер не мой. Васіліса адкрытым тэкстам сказала, што абедзве рэчы купляла сваёй маці. Ёй — не тое не спадабаліся, не тое на 50-ы памер замалыя былі, дык яна іх мне падарыла, на мой 46-ы, бо трэба ж некуды дзець. Як той казаў, вазьмі Даніла, што нам няміла. І нельга ж не ўзяць...

Дапазна ў той вечар мы з Любай сядзелі: меркавалі і так і гэтак, а ўрэшце прыдумалі, што пара і Васілісе нейкі рэбус задаць. Сяброўка на антрэсолі злазіла, дастала адтуль каробку з вялікім сувенірным кубкам (з выявай Дзеда Мароза... Казала, ён гадоў 30 там праляжаў), вырашыла нявестцы падарыць — на дзень нараджэння, 28 жніўня.

...Якраз да яго я з сям'ёй пражыла на дачы. У госці да Любы завітала толькі нядаўна і адразу ж, на знаёмай палічцы, убачыла знаёмы навагодні кубак.

— Не падарыла? — спытала ў Любы.

— Не, — уздыхнула сяброўка. — Я грошай падсабрала... Добры падарунак зрабіла. Абы які — не змагла.

— А яна табе? — нагадала я.

— Дык яна ж яшчэ маладая, — усміхнулася Люба. — Некалі, дасць бог, зразумее, што можна дарыць, што не?

Надзея, кажуць, памірае апошняй.

**Наталля Сямёнава,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж** (і Ніла Гілевіча) мудрае:

*Ці мала што ў жыцці*
*бывае!*
*Якіх вузлоў не вяжа лёс!*
*Няшчасны той,*
*хто ўсё прымае*
*Да сэрца блізка і ўсур'ёз.*

А з гумарам яно ж хоць трохі ды лягчэй. Ці не так?

Пішыце!




Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

Неасабісты суб'ектыў



# Мае Каласавіны

## Экспрэсія ў дзень нараджэння Паэта

НЕ ведаю, чаму, але гэтай восеньскай парой, калі хочацца чагосьці ва ўсіх сэнсах цёплага, я дастаю з кніжнай шафы кніжку менавіта Якуба Коласа. Вось зноў задумалася зараз: чаму? І, здаецца, нарэшце зразумела. З ім — як дома, у роднай хаце. Ён — свой. Не вялікі пісьменнік, якому стаіць помнік у цэнтры сталіцы на плошчы яго імя. Просты дзядзька, які гаворыць з табой на тваёй роднай мове, той, на якой думаеш, на якой бачыш сны, на якой бабуля расказвала казкі і спявала калыханкі.

Дарэчы, менавіта бабка мяне з творчасцю Коласа ўпершыню і пазнаёміла. Што, калі разабрацца, само па сабе дзіва і найлепш сведчыць пра тое, што ён быў і застаецца сапраўды народным паэтам. Бабуля мая была 1905 года нараджэння, скончыла ў свой час толькі пачатковую ці, як тады яна называлася, школу — збольшага ўмела чытаць і пісаць. Але ж нам, малым, дэкламавала: *«У Савосева суседа // Быў пярэсценькі каток, // Выхаванец Паўла-дзеда, // Такі слаўны пястунок!»* Асабліва мне падабалася вось гэта: *«Ну, такі каток харошы, // Як драпянка за тры грошы! // Хадзіў коцік пад масток, // Лавіў рыбку за хвасток...»* Усё было сваё, дакладна так, як казалі ў нашай вёсцы: і пра драпянку за тры грошы (у нас яшчэ быў варыянт «люлька»), і гэты «каток», які пайшоў пад масток і лавіў там рыбку. Я ведала, што было далей, — ён, злавіўшы, засумняваўся: «Ці самому есці, ці Ленанчы несці?» — бо гэта былі словы нашай вясковай калыханкі, якую чула ад той жа бабулі. Тады, канешне, я не спыталася, але цяпер думаю, што бабка наўрад ці ведала аўтара дзіцячага вершыка. Ён быў для яе проста гэткай самай арганічнай часткай жыцця, як і калыханка, якую ёй, напэўна, спявала яе бабуля, а паэту — яго маці...

МНЕ, атрымліваецца, пашанцавала: мы з Якубам Коласам слухалі адну і тую ж калыханку. Яно і не дзіва — мае родныя мясціны зусім побач ад Стаўбцоўшчыны, у нас вельмі падобная гаворка. Ён зрабіў з гэтай гаворкі высокую літаратуру — вось што здзіўляе кожны раз, калі бярэш у рукі яго кнігу і адразу пераносішся дадому, у родную вёску, у родную хату.

А яшчэ падарожжа па коласаўскіх мясцінах (менавіта па коласаўскіх, хоць дзякуючы працы павандравала па месцах, звязаных з жыццём і творчасцю іншых нашых пісьменнікаў) — гэта ніякая не экскурсія, ты прыязджаеш нібы да сваяка ў госці. Першы раз мы выправіліся ў гэта падарожжа пасля сёмага класа — даехалі на электрычцы да Стоўбцаў, пасля з рукзакамі за плячыма ішлі да недалёкіх Акінчыцаў і далей, ажно да Мікалаеўшчыны. Спыніліся на беразе Нёмана, начавалі ў палатках пад дажджом і чыталі... Коласа. *«А дождж шуміць, а дождж гудзе, // І бліжэй-бліжэй ён ідзе // І даль туманам засціале. // Упала кропля і другая...»* А потым, раніцой, калі паветра дыхала вільгаццю, а хвалі Нёмана іскрыліся пад сонечнымі промнямі, мы пайшлі ў сасновы бор, што быў зусім побач, і хтосьці з хлопцаў, знайшоўшы купку летніх баравікоў, нечакана (думаю, што і для самога сябе) выгукнуў Коласава: «Сядзяць грыбы, бы капыты!» Вядома, хтосьці скажа, што тут заслуга і настаўніцы літаратуры (яна, дарэчы, і вадзіла нас у той паход), але ж скажыце, каго, акрамя Коласа, можна цытаваць на ўсе выпадкі жыцця? Не нейкіх там узнёслых пачуццяў ці высокіх матэрый, а звычайнага паўсядзённага жыцця, якое яму ўдалося проста, на адным дыханні пераўтварыць у паэзію.

ХОЦЬ... Чаму не ўзнёслых пачуццяў? *«І ты маўчыш, маўчаць і далі, // Як бы ў адной агульнай хвалі, // Ў адной асветленай часіне // Жыццё злучыла свае плыні // І бег свой вечны прыпыніла...»* Хіба гэта не найлепшае апісанне адчування восені? Хто апіша лепш тое, што хоць аднойчы адчуваў кожны: калі аж дух займае, а слоў сказаць — няма? А Колас знайшоў, каб сказаць за нас, каб нашы думкі і пачуцці — вось так, з віртуознай лёгкасцю — у радкі, якія проста запомніць, бо гэта ж нібыта ты сам і напісаў...

ТРЫ гады назад, рыхтуючы матэрыял па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Коласа, я — дзякуй усім, хто ў гэтым дапамагаў, — аб'ехала за дзень практычна ўсе на Стаўбцоўшчыне. Зноў лавіла сябе на тым, што нібы дома, зноў пракручвала ў памяці радкі, ад якіх цёпла нават глыбокай восенню — а ездзілі мы ў самым канцы кастрычніка. Аналізуючы ўжо па-даросламу, падумала вось пра тое, аб чым пісала напачатку — гэта ўсё з-за таго, што мая радзіма зусім побач... Але тут раптам, ужо калі ехалі на Мінск, дзяўчына-фатограф, у якой карані недзе на Палессі, а бацькі ў сталіцы, выдае: «Такая класная паездка! Як у бабулі ў вёсцы пабыла. Так хораша на душы стала...»

Я з задавальненнем яе слухала, а сама сабе думала: як было б здорава, каб у кожным беларускім доме была (і чыталася хоць зрэдку!) Коласава «Новая зямля». Шмат кажам сёння пра патрыятызм, шмат робім для таго, каб ён быў не пустым гукам. А ў Коласа і з гэтым усё проста, і ўсім зразумела з першых радкоў, бо ўсе іх ведаюць на памяць і чытаюць, бы свае: «Мой родны кут, як ты мне мілы...»

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

## по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2023.Ч.002.00108** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», 210026 г. Витебск, ул. Гагарина, 4 тел. 8 (0212) 36-27-07.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 05.12.2023 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-196220 площадью 459 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-21, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение. Наличие мест общего пользования.

**Нач. цена: 478 000,00** бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 47 800,00 бел. руб.

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-196221 площадью 67 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-22, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение. Наличие мест общего пользования.

**Нач. цена: 71 700,00** бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 7 170,00 бел. руб.

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-196222 площадью 77,3 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-23, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение. Наличие мест общего пользования.

**Нач. цена: 83 100,00** бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 8 310,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 04.12.2023. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Доверителя на проведение независимой оценки по каждому лоту (300,00 бел. руб. с НДС 20 %) и на проведение независимой экспертизы внутренней оценки по каждому лоту (346,80 бел. руб. с НДС 20 %), оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, +375 (33) 317 50 00.

---

ООО «ИПМ-Консалт оценка» информирует **о внесении изменения в перечень имущества ООО «СанБридж»** (публикация извещения в газете «Звязда» от 01.11.2023 г.) **Информацию читать как: «**Лоты №№ 30–31: пароконвектомат RATIONAL CMP 61; лот № 32: подставка UG 2 для пароконвектоматов RATIONAL (CMP61/101). Тел.: +375 17-373-21-33; +375 44-704-92-06, www.ipmtorgi.by

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

## по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2023.Ч.002.00109** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», 210026 г. Витебск, ул. Гагарина, 4, тел. 8 (0212) 36-27-07.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов: 22.11.2023 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв.№ 200/С-51709, площадью 1500,00 кв. м, наименование – котельная, назначение – здание неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4/5, составные части и принадлежности: пристройка, расположенное на земельном участке с кадастровым № 240100000001000497 общей площадью 3,9964 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4 (общая долевая аренда). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством.

**Нач. цена**: 53 625,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 5362,50 бел. руб.

Повторные электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 21.11.2023. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и независимой экспертизы внутренней оценки, и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета эл. торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней с даты проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки и на проведение независимой экспертизы внутренней оценки составляют 638,64 бел. руб. с НДС*. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, +375 (33) 317 50 00

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **здания магазина № 66 с инв. № 620/С-44609 общей площадью 696,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622250100001005548** *(договор аренды земельного участка по 08.11.2121)* **площадью 0,2393 га по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Дзержинск, пер. Коммунистический, д.18.**

Участок расположен в водоохранной зоне реки Нетечка (площадь 0,2393 га), а также в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт (площадь 0,0028 га).

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 247 075,07** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **24 707,00** бел. руб.

